ЖАНОЧЫЯ ПЕРСАНАЖЫ Ў ПОМНІКАХ ЛАЦІНАМОЎНАГА ЭПАСУ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 16–17 СТАГОДДЗЯЎ
FEMALE CHARACTERS IN LATIN EPIC MONUMENTS OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA 16-17 CENTURIES

Некрашэвіч-Кароткая Жанна Вацлаваўна
Брэст, Беларусь

Ключавыя словы: лацінская паэзія, гераічны эпас, Вялікае Княства Літоўскае, Ванда, Соф'я Гальшанская, каралева Крысціна, святая Пракседа Полацкая.

Рэзюмэ. У артыкуле прэзентуюцца жаночыя вобразы ў помніках гераічнага эпасу Беларусі (Вялікага Княства Літоўскага) 16 — першай паловы 17 ст. Да іх адносяцца вобразы князёўны Ванды і каралевы Соф'і Гальшанскай (паэма "Пруская вайна" (1516) Яна Вісліцкага), каралевы Крысціны (паэма "Караламахія" (1606) Хрыстафора Завішы), святой Пракседы Полацкай (паэма "Язафатыда" (1628) Язафата Ісаковіча).

Keywords: latin poetry, heroic epic, the Grand Duchy of Lithuania, Wanda, Sophia of Halshany, Queen Christina, St. Praxedes from Polatsk.

Summary. In the article are presented women's images in the heroic epic poems of Belarus (Grand Duchy of Lithuania) of 16 — the first half of the 17th centuries. These include images of Princess Wanda and Queen Sophia of Halshany (poem "The Prussian War" (1516) of Ioannes Visliciensis), Queen Christina (poem "Carolomachia" (1606) of Christophorus Zawisza), St. Praxedes from Polatsk (poem "Ioasaphatidos" (1628) of Iosaphat Isakowicz) .

Літаратурны канон гераічнага эпасу найбольш выразна быў сфармуляваны Гарацыем у яго сачыненні "*De arte poetica*":

Res gestae regumque ducumque et tristia belli

Quo scribi possent numero, monstravit Homerus [*Horat. De arte. 73–74*]

Гамер паказаў, якім памерам могуць быць апісаны гераічныя дзяянні каралёў і правадыроў, а таксама турботы вайны.

З гэтых радкоў вынікае, што Гамер у сваіх эпічных паэмах "Іліяда" і "Адысея" стварыў не толькі метрычны, але і вобразны канон эпапеі. Цэнтральнае месца ў вобразнай сістэме *carmen heroicum* адводзілася галоўнаму герою, якога Мацей Казімір Сарбеўскі называў "*heros perfectus*" — дасканалы герой. І толькі ў цені галоўнага героя, на перыферыі гераічнай фабулы з'яўляюцца Брысеіда, Алена і Андрамаха ў Гамера, Дыдона і Лавінія ў Вергілія. З'яўленне жаночай постаці ў гераічнай паэме было магчымым яшчэ і дзякуючы традыцыйнай для экспазіцыйнай часткі эпапеі інвакацыі — звароту да боства, увасобленага ў жаночай постаці Музы. Яе з'яўленне, аднак, было абумоўлена выключна патрабаваннямі паэтычнага рытуалу.

Эпоха Рэнесансу ў еўрапейскіх літаратурах захавала *carmen heroicum* на вядучых пазіцыях у жанравай іерархіі, аднак у сувязі з узнікненнем новых правячых дынастый эпапея выступае з 15 ст. пераважна як "гісторыка-панегірычны эпас" (*historisch-panegyrische Epos*) [7, с. 344] або як "эпас пра

гісторыю і сучаснасць” (*historisch-zeitgeschichtliche Epos*) [6, с. 146]. Менавіта такія жанравыя характарыстыкі вызначаюць гераічны эпас “Пруская вайна” Яна Вісліцкага, які быў апублікаваны ў складзе паэтычнага зборніка ў Кракаве ў 1516 г. У першай кнізе “Прускай вайны”, распавядаючы пра Палонію, якую жыхары Заходняй Еўропы з часоў Пталямея ведалі пад назваю Сарматыі, Ян Вісліцкі прыгадвае першых легендарных уладароў гэтай краіны Леха, Крака і Ванду. Каралева Ванда прадстаўлена як *Marcia virgo* (ваяўнічая панна), *maris virtute decora* (з мужчынскаю доблесцю ў сэрцы). Аднак лёс яе не быў шчаслівы: дачка князя Крака марыла пра тое, каб захаваць сваю цноту,

Каб у дзявоцтве ніякага плоду не мець, не развязваць
Пояс Венеры, спавіты святой чысціні прыгажосцю.
Кажуць, што нейкі ўладар, спадкаемец германскага роду,
Сам загадаў выбіраць ёй: ці шлюб і вянкі Гіменэя,
Ці недарэчнасці Марса, пакуты ваеннай навалы.
Ванда з нянавісцю шлюбны саюз адвяргае і ў бітву
Войска кіруе сваё; не паходні вясельныя — стрэлы
Шле жаніху, выклікае яго на крывавую сечу.
Воляй шчаслівага лёсу адолела дзева германца
І атрымала за бітву вянок ганаровы, што лісцем
Лаўравым быў упрыгожаны згодна з традыцыяй продкаў.
Ды нешчаслівы быў лёс той дзяўчыны: з-за бітвы крывавай
Страціла розум яна, адступіла ад Боскае волі
І ад яго бласлаўлення, падобна Сафо ліхадзейнай,
Цела якой, патануўшы, у водах ляжыць леўкадзійскіх…

[*Пруская вайна I, 185–199*; 5, с. 122]

Увасабляючы ў сюжэтнай канве “Прускай вайны” актуальную ў той час палітычную ідэю *translatio imperii* (перанос улады), Ян Вісліцкі супрацьпастаўляе Леху, Краку і Вандзе новую дынастыю магутных уладароў на землях Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, назва якой — Ягелоны — паходзіць ад імя заснавальніка, вялікага князя і караля Ягайлы, які здабыў векапомную перамогу на Грунвальдскім полі ў 1410 годзе, разбіўшы вялікае войска тэўтонцаў. Аднак велічны герой, дажыўшы да сівых валасоў, рызыкаваў памерці не пакінуўшы нашчадкаў. Невыпадкова ў гэтую складаную сітуацыю на пачатку трэцяй кнігі “Прускай вайны” ўмяшаліся самі алімпійскія багі. У якасці чацвёртай жонкі для караля Ягайлы была абраная “чароўная німфа з краіны русінаў” з роду беларускіх князёў Гальшанскіх, якую назвалі “proprio nomine” (уласцівым ёй імем) — Сафія, што ў перакладзе са ст.-грэч. мовы азначае “мудрасць”. Мудрая Соф’я Гальшанская, у адрозненне ад неразумнай, хаця і гераічнай Ванды, не імкнулася здабываць сабе лаўры на полі бітвы.

Перавышае яна гераіняў часоў старажытных
Славай сваёй прыгажосці, выключным яшчэ красамоўствам

[*Пруская вайна III, 80–81*; 5, с. 161].

Ян Вісліцкі быў першым з лацінамоўных паэтаў, хто акцэнтаваў у літаратуры постаць Соф'і Гальшанскай, несправядліва зганьбаванай у шэрагу гістарычных крыніц праз палітычныя інтрыгі вялікага князя Вітаўта. Па звестках польскага бібліёграфа Я. Д. Яноцкага, кароль Ягайла ажаніўся з Соф'яй Гальшанскай «*fere ineunte*» («калі яна ледзь дасягнула паўналецця») у 1422 г. Даследчык адзначае, што каралева «была вельмі добра адукаванай у галіне гуманітарных навук; была надзвычай прыхільнай і шчодрай у адносінах да прафесараў і маладых навучэнцаў Кракаўскай Акадэміі» [4, с. 308–309]. Мішэль, прафесар з Парыжа, які пэўны час працаваў у Кракаве, прысвяціў ёй свае каментарыі да кнігі «Руф». Ужо будучы ўдавою, каля сярэдзіны XV ст., каралева Соф'я займалася рэалізацыяй грандыёзнага філалагічнага праекта. Пад яе апекай Андрэй з Яшовіц, тэолаг Кракаўскага універсітэта, займаўся перакладам Святога Пісьма Старога і Новага Запаветаў на польскую мову «*e veterrimo exemplari slavonico*» («са старадаўняга славянскага экзэмпляра»). На жаль, ужо Яноцкі канстатаваў, што ніхто з яго сучаснікаў не мог адшукаць гэтага кніжнага рарытэта. Гаворка тут ідзе пра славутую Біблію каралевы Соф'і або Біблію Шарашпатацкую, якая лічыцца адным з найбольш каштоўных кніжных рарытэтаў 15 ст. Каралева Соф'я падарыла Ягайлу трох сыноў, двое з якіх здабылі каралеўскі сталец. Падарыўшы сваю любоў і пяшчоту каханаму мужу, Соф'я Гальшанская атрымала Божую ласку. Гэтай ласкі не мела Ванда, нягледзячы на тое, што яна захавала сваю дзявоцкасць.

Дыстантнае супрацьпастаўленне Ванды і Соф'і ў "Прускай вайне" Яна Вісліцкага выклікае асацыяцыю з пашыраным у хрысціянскім пісьменстве супрацьпастаўленнем двух цэнтральных жаночых постацяў Святога Пісання — прамаці ўсіх людзей Евы і Найсвяцейшай Багародзіцы Панны Марыі. Гэтых дзвюх біблейскіх жанчын супаставіў адзін з першых айцоў Касцёла Ірэней Ліонскі (каля 130–202) у сваім трактаце «Супраць ерасяў» (кніга 3, раздзел 22). Хоць Ева мела мужа Адама, аднак заставалася цнатлівай, жывучы ў раі. Праявіўшы непаслушэнства, яна зрабілася прычынаю смерці і для сябе, і для ўсяго роду чалавечага. Пазней «вузел непаслушэнства Евы быў развязаны паслушэнствам Марыі; бо што звязала Ева праз нявернасць, тое Панна Марыя развязала праз веру» [1]. Ванда, якая не жадала развязаць свой пояс Венеры, загінула, апанаваная нечаканым вар'яцтвам; Соф'я, якая па волі багоў аддала сваю руку і сэрца сівавалосаму Ягайлу, зрабілася маці каралёў.

Жанчыны, якія з'яўляюцца ў помніках гераічнага эпасу з-пад пяра беларускіх аўтараў, адметныя перадусім сваёй мудрасцю. У эпічнай паэме "Караламахія", прысвечанай перамозе над шведамі пад Кірхгольмам у 1605 г., гетман Ян Караль Хадкевіч, які здабыў гэтую перамогу, супрацьпастаўляецца шведскаму валадару Карлу IX. Гэты манарх не карыстаецца павагаю ні ў каго — нават у сваёй жонкі. Каралева Крысціна, звяртаючыся да мужа, услаўляе не яго, а гетмана Хадкевіча; на Карла ж яна толькі наракае:

Ille comes CAROLVS Lituanae gentis Achilles,
Quem CHODKIEWICIO celebrant e sanguine cretum
Ductorem insignem fama; et felicibus armis.
Si Gothici quid Martis habes, illum aspice contra,
Si qua tibi virtus animo, tibi si qua manu vis.
Neue fugae fidens porro tua nomina foedes:
Neu Gothicum infusces olim praenobile nomen.
[*Zawisza. Carolomachia*, *417–423*][1]

Славуты граф Караль — Ахілес літоўскага народа; яго, выдатнага ваяводу з крыві Хадкевічаў, праслаўляюць за веліч і за паспяховыя бітвы. Калі ты маеш штосьці ад гоцкага Марса, то паглядзі на яго варожа, калі ў тваёй душы ёсць нейкая доблесць, калі ў тваёй руцэ ёсць нейкая сіла. Няўжо, спадзеючыся на ўцёкі, ты і далей будзеш ганьбіць свае імёны? Няўжо ты заплямiш такое высакароднае калісьці імя?

Але гэтыя заклікі не маюць ніякага выніку. Карл IX не паслухаў сваю мудрую жонку, што і перадвызначыла яго ганебную паразу.

Жаночы персанаж прадстаўлены і ў помніку агіяграфічнага эпасу — паэме “Язафатыда, або Пра забойства Язафата Кунцэвіча” (1628) Язафата Ісаковіча. На пачатку кнігі другой перад чытачом прадстае разгневаны Госпад Бог: абводзячы сваім суровым позіркам далягляды Полацка, Оршы і Магілёва, ён, звяртаючыся да святой Пракседы (або Параскевы, полацкай князёўны), паведамляе ёй пра сваё рашэнне пакараць упартых “раксіялаў” (*Raxialis populis*) за іх адданасць “схізме”. У гневе паклікаў Усявышні свайго “крылатага служку” — анёла, загадаўшы яму “дзверы святыні збурыць ды абрушыць жалезную браму”; у выніку суровай кары “сотнямі згіне народ, незлічоныя бедствы настануць, // шмат пакаранняў ліхіх: і нястача, і пошасць, і голад” [2, с. 299]. Анёл павінен быў выправіцца ў шлях дзеля выканання даручэння, аднак нябесная апякунка Белай Русі спыніла нябеснага валадара, папрасіўшы яго прытрымаць справядлівы гнеў. Аргументам з’яўляецца прыход у Полацкую зямлю арцыбіскупа Кунцэвіча: менавіта ён, на думку Пракседы, і павінен паспрыяць утаймаванню рэлігійных непаразуменняў і ўмацаванню хрысціянскай веры.

Боскі Айцец у адказ ёй спагадлівым голасам кажа:
“Полацк суседні цябе добра ведаў з дзяцінства, о панна,
З гэтай прычыны цяпер Я адкіну свой гнеў справядлівы,
Стану лагодным, раз ты так пакорліва моліш і просіш [2, с. 300].

Менавіта пакорлівасць і спагада здолелі пераканаць нават Усявяшняга. Пры гэтым паэт-эпік адмысловымі мастацкімі сродкамі (у якіх, магчыма, можна бачыць першыя крокі псіхалагізму ў літаратуры) дэманструе ўнікальныя здольнасці жанчыны ў майстэрстве пераканання:

Глянь, Божа мой, зазірні ты ў Кунцэвіча чыстае сэрца.
Гэткім ён ёсць (Ты і сам галавою ківаеш, што ведаў)… [2, с. 300].

[1] Паэма «Караламахія” цытуецца паводле навуковага перавыдання тэкста, гл.: 3.

Жаночыя постаці ў помніках гераічнага эпасу, створаных беларускімі аўтарамі эпох Рэнесансу і Барока, адметныя менавіта тымі рысамі, якія пазней уславяць у беларускіх жанчынах Адам Міцкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Янка Купала і Якуб Колас, Іван Мележ і Васіль Быкаў: душэўнай ураўнаважанасцю, мудрасцю, пяшчотай, цярплівасцю і пакорлівасцю. У радках урачыстага гекзаметра беларускія паэты-эпікі здолелі побач з велічнымі героямі-ратнікамі або героямі-падзвіжнікамі прадставіць не менш велічныя вобразы жанчын. Яны дастаткова сціпла, эпізадычна прадстаўлены ў сюжэтным плане твораў. Але гэта тыя эпізоды, без якіх эпічная выява выглядала б трывіяльна і шэра. Пры гэтым падкрэсліваецца здольнасць жанчын не магутнай дзясніцай і не жалезнай зброяй, але сваімі ўласнымі, адным жанчынам вядомымі спосабамі ўлагодзіць гнеў, аднавіць парушаную справядлівасць, усталяваць спрадвечную гармонію.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Иреней Лионский. Против ересей [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://txt.drevle.com/lib/irinei_lionskiy-protiv_eresei.html. — Дата доступу: 25.01.2014.

2. Ісаковіч, Язафат. Язафатыда (урыўкі) ; пер. з лац. мовы, камент. Ж. Некрашэвіч-Кароткай // Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў / уклад. А.У. Бразгунова, С.Л. Гараніна ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. — Мінск : Маст. літ., 2012. — С. 292–302.

3. Bojeris, L. Karolomachija: Poema / iš lot. k. vertė B. Kazlauskas; Įvadą, parašė A. Tyla; Pabaigos str., parašė S. Narbutas. — Vilnius: Vaga, 1991. — 188, [2] p.

4. Janociana sive Clarorum atque illustrium Poloniae auctorum mecenatumque memoriae miscellae. Nunc primum e Codicibus, Biblioth. Publ. Vars. edidit S. T. Linde. — Varsaviae: Typis Collegii Scholarum Piarum, A.R.S. MDCCCXIX (1819).

5. Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum = Ян Вісліцкі. Пруская вайна: на лац. і бел. мовах / уклад., перакл., камент. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай. — Мінск: Прапілеі, 2005. — 234 с.

6. Hoffmann, H. Von Africa über Bethlehem nach America: Das Epos in der neulateinischen Literatur / Heinz Hoffmann // Von Göttern und Menschen erzählen. Formkonstanzen und Funktionswandel vormoderner Epik / hrsg. Jörg Rüpke. — Stuttgart: Steiner, 2001. — S. 130–182.

7. Traube, L. Einleitung in die lateinische Philologie des Mittelalters / Ludwig Traube; hrsg. von Paul Lehmann. — München: Oskar Beck, 1911. — VIII, 176 S.